ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 16 (1014) ● ЧАЦВЕР, 17 мая 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

● Да дня выбараў у мясцовыя Саветы ● Камсамольскае жыццё ● Даследуюць студэнты ● У групах і на курсах ● Кнігі нашых выкладчыкаў ● БДУ — спартыўны

## З ПАЗІЦЫЙ НАВУКОВАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

Вучоны савет універсітэта заслухаў даклад прарэктара па вучэбнай рабоце прафесара С. А. Умрэйкі «Аб навуковай арганізацыі навучальнага працэсу і яго планавання на 1973—1974 навучальны год». Дакладчык адзначыў, што прынятая ЦК КПСС і Саветам Міністраў СССР пастанова «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне» вызначыла не толькі меры расшырэння маштабаў вышэйшай адукацыі, але і змянення яе структуры, зместу, форм і метадаў навуковай арганізацыі навучальнага працэсу. Таму і ў зацверджаным рэктаратам і парткомам плане мерапрыемстваў па выкананню гэтай пастановы многа ўвагі аддаецца навуковай арганізацыі навучальнага працэсу.

Што трэба разумець пад навуковай арганізацыяй навучальнага працэсу? Дакладчык тлумачыць: комплекс мерапрыемстваў, звязаных з правільным адборам інфармацыі, якая адпавядае сучаснаму ўзроўню навукі, тэхнікі, вытворчасці і культуры і перспектывам іх развіцця; з навукова абгрунтаваным планаваннем вучэбнай работы; удасканаленнем навучальнага працэсу шляхам больш эфектыўнай пастаноўкі навукова-метадычнай работы і выкарыстання тэхнічных сродкаў; вывучэннем і на гэтай падставе разумным выкарыстаннем бюджэту часу студэнтаў і выкладчыкаў; з падрыхтоўкай і павышэннем кваліфікацыі навукова-педагагічных кадраў; правільнай расстаноўкай і мэтанакіраваным выкарыстаннем выкладчыкаў; удасканаленнем камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі; паляпшэннем умоў працы, быту і адпачынку студэнтаў і выкладчыкаў.

Дакладчык больш падрабязна выклаў змест некаторых з пералічаных бакоў праблемы, падкрэсліў, што навуковая арганізацыя навучальнага працэсу — гэта не ломка традыцыйных метадаў і форм навучання, а далейшае ўдасканаленне таго, што набыта, разумнае спалучэнне новага і традыцыйнага.

Прыняўшыя ўдзел у абмеркаванні даклада прафесары А. Н. Сеўчанка, В. Р. Заўрыеў, І. С. Цішкевіч, Ф. М. Нячай, дэкан фізфака І. П. Зяцькоў, дэкан факультэта па навучанню замежных грамадзян К. К. Герман, прарэктар па навуковай рабоце Л. В. Валадзько, начальнік ваеннай кафедры У. В. Лютаў заваострылі ўвагу на неабходнасці больш напружанай самастойнай работы студэнтаў і актывізацыі лекцыйнага ўздзеяння; удасканаленні праграм курсаў і метадычнай работы; больш шырокім выданні вучэбных дапаможнікаў; дакладнай спецыялізацыі навучання; папаўненні лабаранцкага саставу і г. д.

Падводзячы вынікі абмеркавання, рэктар БДУ прафесар У. М. Сікорскі выказаў думку, што прапанаваны даклад дасць штуршок творчай рабоце на факультэтах і кафедрах у кірунку навуковай арганізацыі працы. Звернута ўвага на абагульненне перадавога вопыту і распаўсюджанне яго. Ёсць цікавыя рашэнні ўзнятых у дакладзе пытанняў на геаграфічным, гістарычным і іншых факультэтах, і трэба, каб дасягненні факультэцкіх калектываў, карысныя знаходкі ў навуковай арганізацыі працы хутчэй станавіліся здабыткам усіх.

Савет універсітэта пастанавіў:

Адобрыць асноўныя палажэнні даклада.

Дэканам факультэтаў, метадычным камісіям і загадчыкам кафедр абмеркаваць на саветах, пасяджэннях камісій і кафедр меры па практычнаму ўкараненню навуковай арганізацыі навучальнага працэсу ў 1973—1974 навучальным годзе.

Вучэбнаму аддзелу, дэканатам і кафедрам арганізаваць вывучэнне лепшага вопыту ў іншых вну і ва універсітэце і ўкараняць яго ў практыку.

Рэдакцыям «Весніка» і газеты «Беларускі універсітэт» увесці рубрыку «З вопыту ўкаранення навуковай арганізацыі навучальнага працэсу».

Лічыць мэтазгодным па плану рэктарата заслухаць на савеце універсітэта ў 1973—1974 навучальным годзе даклад аднаго з дэканаў і загадчыкаў кафедр аб укараненні ў навучальны працэс больш дасканалых яго форм і метадаў, загадзя вывучыўшы стан гэтай работы на факультэце.

Рэкамендаваць агульнауніверсітэцкім кафедрам і кафедрам факультэтаў уключыць у планы навуковых даследаванняў распрацоўку праблем навуковай арганізацыі навучальнага працэсу.

Аддзелу навукі універсітэта распрацаваць прыкладную тэматыку даследаванняў указаных праблем і давесці яе да факультэтаў і кафедр да 1 кастрычніка 1973 года.

## 17 чэрвеня — Дзень выбараў у мясцовыя Саветы

Ва універсітэце ідзе падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных. На факультэцкіх сходах прафесарска-выкладчыцкага саставу, рабочых і служачых вылучаны кандыдатуры ў састаў акруговай выбарчай камісіі. Камісія ўжо прыступіла да работы.

У корпусе юрыдычнага факультэта працуе агітпункт. Узначальвае яго старшы выкладчык кафедры грамадзянскага права і працэсу юрыдычнага факультэта В. П. Дуюн. Кожны вечар расчыняюцца перад выбаршчыкамі дзверы гэтага невялікага і ўтульнага пакоя. Тут можна знайсці літаратуру або атрымаць кансультацыю па савецкай выбарчай сістэме, пагартаць свежыя газеты і часопісы.

План работы агітпункта прадугледжвае многа цікавых мерапрыемстваў: гутаркі аб дэмакратычных прынцыпах Савецкай выбарчай сістэмы, сустрэчы з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, дэманстрацыю фільмаў, юрыдычныя кансультацыі па сямейнаму і крымінальнаму праву, сустрэчы выбаршчыкаў з дэпутатамі Акцябрскага райсавета мінулага склікання і з кандыдатамі ў дэпутаты.

Нядаўна адбыўся вечар для маладых выбаршчыкаў. Студэнты праслухалі лекцыю «Выбарчая сістэма СССР», паглядзелі канцэрт мастацкай самадзейнасці.

**Л. АРЛОВА.**

## СЛАЎНА ПАПРАЦАВАЛІ

Водгукі аб ударнай працы нашых студэнтаў у час Камуністычнага суботніка працягваюць паступаць ва універсітэт. Вось адно з пісьмаў, якое прыйшло ў адрас рэктарата з Першага Мінскага мантажнага ўпраўлення спецтрэста «Белсантэхмантаж» № 2. У ім гаворыцца: «Кіраўніцтва, партбюро, будаўнічы камітэт з вялікім задавальненнем адзначаюць актыўны ўдзел студэнтаў і выкладчыкаў філалагічнага факультэта ў нядзельніку на будаўнічых аб'ектах на базе нашага ўпраўлення. У ім прынялі ўдзел 250 студэнтаў і пяць выкладчыкаў. Усе яны працавалі з вялікім натхненнем і стараннем і поўнасцю выканалі дадзеныя ім заданні. У выніку добраўпарадкавана тэрыторыя базы, на аб'ектах праведзены падрыхтоўчыя работы па мантажу сантэхсістэм на будаўніцтве 289-кватэрнага жылога дома і двух інтэрнатаў.

Кіраўніцтва, партбюро і будаўнічы камітэт дзякуюць студэнтам, выкладчыкам, кіраўніцтву філалагічнага факультэта і рэктарату за вялікую дапамогу ў выкананні планаў капітальнага будаўніцтва ў трэцім, рашаючым годзе пяцігодкі і жадаюць паспяховага завяршэння навучальнага года».

## ТВОРЧЫ САЮЗ

Ва універсітэце ўваходзяць у традыцыю аб'яднаныя пасяджэнні кафедр грамадскіх і спецыяльных дысцыплін.

Развіваючы мінулагодні вопыт, кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў правяла нядаўна сумеснае пасяджэнне з кафедрай фізічнай геаграфіі зарубежных краін. Запланавана падобная сустрэча з калектывамі кафедр факультэта прыкладной матэматыкі для абмеркавання філасофскіх пытанняў кібернетыкі.

На павестку дня аб'яднанага пасяджэння кафедр марксісцка-ленінскай філасофіі і фізічнай геаграфіі зарубежных краін былі пастаўлены актуальныя тэарэтычныя пытанні геаграфічнай навукі.

З дакладам «Аб прадмеце фізічнай геаграфіі і аб задачах аховы прыроды» выступіў загадчык кафедры, прафесар В. Р. Заўрыеў. Ён асвятліў развіццё геаграфічнай навукі ў апошнія гады, яе перспектывы, значэнне для народнай гаспадаркі краіны, практычныя работы географаў на тэрыторыі краіны і ў нашай рэспубліцы.

В. Р. Заўрыеў падкрэсліў вялікае сацыяльнае значэнне праблем аховы прыроды і рацыянальнага выкарыстання прыродных багаццяў, паказаў канкрэтную розніцу ў падыходзе да прыроды ва ўмовах капіталістычнай сістэмы і развітога сацыялістычнага грамадства. Было прыведзена многа цікавых фактаў. Даклад выклікаў вялікі інтарэс і шмат пытанняў, на якія адказаў прафесар В. Р. Заўрыеў.

Дацэнт Э. В. Клёсава, выступаўшая з садакладам «Аб адзінстве філасофіі і геаграфіі», паказала агульныя тэарэтычныя вытокі марксісцка-ленінскай філасофіі і фізічнай геаграфіі, раскрыла на прыкладзе геаграфіі і геалогіі палажэнне аб ператварэнні навукі ў непасрэдную прадукцыйную сілу. Дакладчык падкрэсліла таксама значэнне метадалагічных прынцыпаў дыялектычнага матэрыялізму для развіцця фізічнай геаграфіі.

Ва ўмовах сучаснай навукова-тэхнічнай рэвалюцыі велізарнае значэнне набывае выхаваўчае значэнне геаграфічнай навукі, правільнае разуменне заканамернасцей прыроды. Філасофія і геаграфія адзіныя ў выхаванні навуковага матэрыялістычнага светапогляду.

У выступленнях дацэнтаў І. Г. Родзіна, М. І. Жукава, прафесара В. І. Сцяпанава была падкрэслена важнасць адбыўшагася абмеркавання. Намечаны шляхі далейшай сумеснай навуковай работы дзвюх кафедр.

**М. РАМАНКЕВІЧ,**
**супрацоўніца кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі.**





Набліжаецца сесія. І на сённяшнім пасяджэнні кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі галоўнае пытанне — абмеркаванне экзаменацыйных білетаў. Дакладвае дацэнт кафедры А. І. Самускевіч (на здымку злева).

Фота Д. Чаховіча.

У групах і на курсах

## МЫ— ВУЧЫМСЯ

Мы—гэта III група першага курса матфака. Мы вельмі розныя, але ёсць у нас адно, агульнае для ўсіх, — любоў да матэматыкі. Па выніках першага семестра наша група — лепшая на курсе. Чаму? Спачатку было цяжка, як і ўсім пачынаючым. Ад напружання балела галава. Канешне, не хапала і часу. Гэта быў самы цяжкі перыяд, перыяд пераходу ад школы да універсітэта, асваенне складанай праграмы вучобы, перабудова мыслення. І мы паступова прывыклі, хоць некаторым для гэтага спатрэбіўся цэлы семестр. У многім нам дапамагалі сустрэчы са студэнтамі старшых курсаў. Яны расказвалі нам аб тым, як трэба рыхтавацца да экзаменаў, як рацыянальна размяркоўваць свой час. Актыўна пачаў працаваць акадэмічны сектар, які ўзначальвае Ю. Цішын, і к канцу семестра справы наладзіліся.

Першую сесію мы здалі лепш, чым астатнія групы нашага курса. Але гэта не мяжа.

У другім семестры справы пайшлі больш паспяхова, хлопцы і дзяўчаты сталі наведваць гурткі па матаналізу, лінейнай і вышэйшай алгебры. Заняткі ў гуртках вельмі дапамаглі нам у засваенні вучэбнай праграмы, павысілі паспяховасць, расшырылі наш кругагляд.

Ажывілася і грамадскае жыццё ў нашай групе. Асабліва спадабаліся і запомніліся ўсім гутаркі аб ГДР, аб космасе (падрыхтаваў яе С. Марцьянаў). На сваім патоку мы правялі канферэнцыю аб культуры паводзін савецкага чалавека. Добра, што аднакурснікі імкнуцца не толькі выдатна вучыцца, але і ўдзельнічаць у грамадскай рабоце, займацца спортам. Спорт дапамагае дабівацца поспехаў у вучобе.

Хутка зноў экзамены. Набліжэнне сесіі, канешне ж, крыху хвалюе. Але мы верым, што другая сесія будзе здадзена лепш за першую, таму што ўсе магчымасці для гэтага ў нас ёсць.

**А. СУРКОЎ,**
камсорг.
**С. ПАТАПЕНКА,**
стараста.

Камсамольскае жыццё

## І ДАПАМОГА, І ДРУЖБА

Студэнтаў-шэфаў, калі яны працуюць з агеньчыкам і ўкладваюць у сваю справу ўсю душу, заўсёды з радасцю сустракаюць і ў школах, і ў дзіцячых пакоях, і ў воінскіх часцях. На пасяджэнні партбюро факультэта прыкладной матэматыкі, дзе падводзіліся вынікі работы камсамольцаў у падшэфных арганізацыях, шэфскі сектар быў адзначан як адзін з лепшых ва універсітэце. Кіруе сектарам студэнтка III курса Л. Малькова.

Работа сектара нялёгкая. Асаблівасці гэтай работы ў тым, што большасць падшэфных — гэта школьнікі 5—8 класаў, г. зн. самы «цяжкі» ўзрост. Важатыя павінны мець талент выхавацеля, не толькі быць выдатнымі арганізатарамі, эрудытамі, але і вельмі чулымі, уважлівымі педагогамі. І вось, напэўна, гэтая цяжкасць, якая абяцае радасць адносін, узаемнае давер'е важатага і школьніка, і прыцягвае многіх студэнтаў у педатрады.

У дзіцячых пакоях пры домакіраўніцтвах працуюць два педатрады ФПМ. Яны дапамаглі наладзіць тут работу гурткоў і секцый, устанавілі дзяжурствы важатых. Са сваімі абавязкамі студэнты спраўляюцца добра. Многія з іх карыстаюцца заслужаным аўтарытэтам. Асабліва хочацца адзначыць Т. Мінаеву, Р. Аўласенку, Г. Гуцыеву. Гэта першакурснікі, але зарэкамендавалі яны сябе нядрэнна.

У пяці падшэфных школах студэнты дапамагаюць вучням праводзіць зборы атрадаў, рэпетыцыі мастацкай самадзейнасці, розныя конкурсы. У СШ № 18 Мінска важатыя арганізавалі перапіску з піянерамі г. Севастопаля, з кіргізскімі школьнікамі. Тут хутка асвоіліся і працуюць студэнты Н. Хоха і Л. Халадзіліна. Піянерам СШ № 110 студэнты аказваюць дапамогу ў вывучэнні матэматыкі, фізікі. Разам са сваімі важатымі вучні робяць культпаходы ў кіно, музеі, вывучаюць гісторыю роднага краю.

Даўнія сувязі існуюць у камсамольцаў ФПМ з Ляхавіцкай і Негарэльскай школамі Дзяржынскага раёна і Слабодскай школай Стаўбцоўскага раёна. Тут студэнты чытаюць лекцыі аб універсітэце, расказваюць аб сваім студэнцкім жыцці, дапамагаюць ва ўсім. Нядаўна яны сабралі каля 500 кніг і перадалі іх у Ляхавіцкую школу. Любяць і паважаюць у гэтай школе важатую, студэнтку IV курса Л. Цацура, якая з натхненнем працуе з вучнямі.

Не парываюцца сувязі і з падшэфнымі воінскімі часцямі, куды часта завітвае з канцэртамі факультэцкая агітбрыгада.

Аб рабоце важатых ФПМ можна гаварыць яшчэ шмат. Але і тут, п э ў н а, сустракаюцца цяжкасці. Вось што гаворыць Л. Малькова:

— Цяжкасці? Яны, вядома, бываюць. Я, напрыклад, кірую сектарам толькі год і спачатку многае не ведала. Рабіць першыя самастойныя крокі заўсёды цяжка, а вопытных настаўнікаў у мяне не было. Праўда, часта дапамагаў парадамі А. Новікаў, кіраўнік нашай агітбрыгады. Але цяпер сектар, як кажуць, стаў на ногі. Сённяшнія цяжкасці — гэта, у асноўным, вырашэнне арганізацыйных пытанняў: дзе знайсці добрага баяніста для дзіцячага пакоя, як дастаць для школ неабходныя дапаможнікі, падрыхтаваць ранішнікі і г. д.

Нягледзячы на тое, што зроблена нямала, камсамольцы шукаюць усё новыя формы і метады работы са сваімі падшэфнымі. Напрыклад, у пачатку сакавіка разам з факультэцкай агітбрыгадай у Ляхавіцкую школу ездзіў танцавальны калектыў аднаго з падшэфных дзіцячых пакояў. Такая сумесная паездка была арганізавана ўпершыню і прайшла паспяхова.

Адным словам, можна быць упэўненым, што ў шэфскім сектары будуць і далей працаваць з натхненнем, ініцыятывай, працаваць так, каб шэфства было сапраўднай дапамогай, дружбай.

**С. ШЫДЛОЎСКАЯ,**
(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).

## НОВЫХ ПОСПЕХАЎ!



*Ідзе пасяджэнне вучонага савета. Ля дошкі — наш добры знаёмы, выпускнік фізфака і аспірантуры БДУ Нгуен Куанг Мінь. З 1962 года ён быў студэнтам, пасля заканчэння універсітэта працаваў на радзіме, а потым вярнуўся ў Мінск, каб завяршыць работу над зацікавіўшай яго навуковай праблемай.*

*І нарэшце, абарона дысертацыі на тэму «Вывучэнне ўплыву гама - выпраменьвання на параметры фотаэлектронных памнажальнікаў».*

*Навуковы кіраўнік, афіцыйныя апаненты адзначылі працавітасць і навуковую добрасумленнасць дысертанта, высокі эксперыментальны ўзровень і актуальнасць работы маладога вучонага.*

*Члены вучонага савета, вядомыя беларускія фізікі цёпла павіншавалі в'етнамскага калегу і пажадалі яму далейшай плённай працы на радзіме.*

*Тэкст і фота*
*М. НЕЧЫПАРЭНКІ.*





## У РОЛІ ДАСЛЕДЧЫКАЎ

Вялікая ўвага да навукова-даследчай работы студэнтаў, якая знайшла непасрэднае адлюстраванне ў вядомай пастанове партыі і ўрада «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне», невыпадковая, таму што яна садзейнічае павышэнню якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, развівае творчую ініцыятыву, прывівае навыкі даследчай працы.

Значна палепшылася навукова-даследчая работа студэнтаў у нас, на юрыдычным факультэце. Асноўная яе форма — удзел у студэнцкіх навуковых гуртках. Цяпер на факультэце дзейнічае 18 такіх гурткоў, у якіх працуе каля 400 чалавек, г. зн. больш 40 працэнтаў усіх студэнтаў.

Прафесары і пераважная большасць выкладчыкаў прыцягнуты да кіраўніцтва студэнцкімі навуковымі даследаваннямі. На рэспубліканскім аглядзе з 32 прадстаўленых работ 9 аднесены да І катэгорыі, 20 — да ІІ і толькі 3 работы — да ІІІ.

Значную арганізацыйную работу праводзіць сектар савета СНТ, якім кіруе студэнт III курса А. Шчэма. Сектар плануе работу, выпускае інфармацыйныя бюлетэні.

Вялікае значэнне надаецца правядзенню традыцыйных навуковых канферэнцый, на якіх падводзяцца вынікі студэнцкай навуковай творчасці. Выступаючы з дакладамі і навуковымі паведамленнямі, студэнты дэманструюць сваю навуковую эрудыцыю, вынікі творчых пошукаў. Канферэнцыі — важная форма выхавання і падрыхтоўкі маладых спецыялістаў. Яны ўмацоўваюць і пашыраюць сувязі паміж вну і садзейнічаць абмену вопытам навуковай работы.

У час XXX універсітэцкай студэнцкай навуковай канферэнцыі прайшлі секцыйныя пасяджэнні і на нашым факультэце. У шасці секцыях было заслухана і абмеркавана 46 навуковых паведамленняў. Усе яны прысвечаны актуальным пытанням дзяржавы і права і маюць значную цікавасць. У прыватнасці, увагу ўдзельнікаў прыцягнулі змястоўныя паведамленні студэнтаў В. Хорава «XXIV з'езд КПСС і фарміраванне сучаснага міжнароднага права» (навуковы кіраўнік дацэнт Б. І. Жэрліцын); Н. Зінчанкі «Адзінаначалле і калегіяльнасць у кіраванні прадпрыемствам» (навуковы кіраўнік дацэнт П. К. Еўдакімаў); Капусцінай «Бюджэтныя правы мясцовых Саветаў» (навуковы кіраўнік доктар юрыдычных навук С. Р. Віхараў); Р. Дзмітрук «Крымінальнае ўлажэнне 1903 г. у Расіі» (навуковы кіраўнік дацэнт В. В. Сарокіна); Л. Савасцьянавай і многіх іншых.

З цікавымі навуковымі дакладамі выступілі нашы госці — студэнты эканоміка-прававога факультэта Калінінградскага універсітэта Н. Раззарыцелева і В. Іваноў, слухач Мінскага факультэта ВШ МВД СССР Грынёў.

Прыемна адзначыць, што на канферэнцыі былі прадстаўлены ўсе курсы факультэта. Актыўна ўдзельнічае ў рабоце навуковага гуртка студэнт-вячэрнік І. Басецкі, які выступіў на пасяджэнні секцыі дзяржаўнага, адміністрацыйнага права і савецкага будаўніцтва з паведамленнем на тэму «Аб некаторых пытаннях абнаўлення саставу дэпутатаў мясцовых Саветаў БССР».

Многія нашы студэнты прынялі ўдзел у студэнцкіх навуковых канферэнцыях іншых вну краіны. У прыватнасці, трэцякурснік В. Гаро выступіў з навуковым паведамленнем у Тартускім універсітэце, пяцікурсніца І. Пагарэлава —у МДУ, Л. Савасцьянава —у Казанскім, А. Гаўрынаў — у Кіеўскім універсітэтах, К. Якімовіч — у Харкаўскім юрыдычным інстытуце і г. д.

Канферэнцыя не завяршыла навуковую работу студэнтаў у бягучым навучальным годзе. Прадстаіць выбраць і рэкамендаваць на гарадскі і рэспубліканскі конкурсы лепшыя са студэнцкіх прац.

Далейшага павышэння патрабуе ўзровень студэнцкай навукова-даследчай работы. Да ўдзелу ў гуртках трэба шырэй прыцягваць студэнтаў вячэрняга аддзялення. Неабходна прадумаць і арганізацыйна вырашыць пытанне аб формах суадносін вучэбнай і навукова-даследчай работы. Студэнтам, якія вызначыліся, трэба смялей даваць магчымасць займацца па свабоднаму раскладу, індывідуальных планах. Станоўча ўплывала б на даследчую работу студэнтаў і выданне зборнікаў тэзісаў навуковых дакладаў і паведамленняў. Карысны таксама абмен вопытам арганізацыі навукова-даследчай работы студэнтаў паміж факультэтамі.

**І. МАРЦІНОВІЧ,**
прафесар, куратар СНТ.

# ДРУГАЯ СЛАВІСТЫЧНАЯ

Відаць, гэта заканамерна, што наш універсітэт — вядучая ВНУ рэспублікі — стаў першым і ў такім важным навуковым пачынанні, як арганізацыя і правядзенне рэспубліканскіх славістычных канферэнцый. Афіцыйна такія канферэнцыі носяць назву «Тыпалогія і ўзаемадзеянне славянскіх моў і літаратур» і праводзяцца раз у пяць гадоў— як і сусветныя з'езды славістаў. Дарэчы, адбываюцца яны таксама ў год правядзення з'ездаў славістаў. Так, першая канферэнцыя прыпала на 1968 год, сёлетняя праходзіць напярэдадні VII міжнароднага з'езда славістаў, які ў жніўні збярэцца ў Варшаве.

У праграме канферэнцыі, што сёння пачынае сваю працу на філалагічным факультэце, — каля 180 навуковых дакладаў і паведамленняў. У асноўным гэта даклады беларускіх славістаў, вучоных універсітэтаў і педінстытутаў рэспублікі. З іх большасць прадстаўлена выкладчыкамі васьмі філалагічных кафедр БДУ. Аднак заяўкі на ўдзел у канферэнцыі падало нямала вучоных-філолагаў з Расіі, Украіны, Прыбалтыкі, Малдавіі і іншых краёў і рэспублік Савецкага Саюза. Прыязджаюць у Мінск і вучоныя - славісты трох універсітэтаў, з якімі БДУ падтрымлівае асабліва цесныя кантакты, — Іенскага, Сафійскага і Кракаўскага. Гэта сведчыць і пра папулярнасць «мінскай славістычнай», і пра прызнанне навуковых заслуг славістаў нашага універсітэта, у прыватнасці — супрацоўнікаў кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства. Вучоныя кафедры, і перш за ўсё яе загадчык А. Я. Супрун,—ініцыятары і актыўныя ўдзельнікі правядзення гэтых канферэнцый.

Толькі на пленарным пасяджэнні будуць заслуханы даклады прафесараў М. Р. Ларчанкі «Праблема вывучэння ўзаемасувязей славянскіх літаратур», А. Я. Супруна «Праблема сістэмнай арганізацыі спецыяльнай лексікі ў славянскіх мовах», М. І. Краўцова «Прагрэсіўна - дэмакратычная паэзія славянскіх народаў канца XIX—пачатку XX стагоддзя», А. І. Жураўскага «Праблема пераемнасці ў гісторыі беларускай літаратурнай мовы», У. В. Анічэнкі «Узаемадзеянне беларускай і рускай моў з кніжнаславянскай у жанры лінгвістычнай літаратуры XVII ст.». Асаблівая ўвага ўдзяляецца сувязям беларускай мовы і літаратуры з рускай, украінскай, польскай і іншымі славянскімі, а таксама тэорыі і практыцы міжславянскага перакладу. Гэтым праблемам прысвячаюцца даклады М. Г. Булахава, А. А. Лойкі, П. П. Шубы, Л. М. Шакуна, М. І. Талстога, С. М. Небарачкі, Л. І. Мішчанкі, А. І. Дзенісюка, Л. П. Бондар, Л. У. Жыдзяк, В. А. Захаравай, В. В. Казловай, У. М. Лазоўскага, У. І. Лучука, І. В. Шадурскага і іншых. Зрэшты, са зместам гэтых і многіх іншых навуковых выступленняў зможа пазнаёміцца кожны жадаючы — з друку выходзяць тэзісы дакладаў і паведамленняў.

Другая славістычная пачынае сваю работу. Несумненна, яна ўнясе шмат новага ў распрацоўку праблем узаемадзеяння славянскіх моў і літаратур, у айчынную філалогію. **В. РАГОЙША.**



**На здымках:** практычныя заняткі па матэматычнаму аналізу ў студэнтаў І курса ФПМ. Ля дошкі—Інасенсія **Лімонта** (Куба).

Фота **Д. Чаховіча.**



## КАБ ЖУРНАЛІСТАМ ЗВАЦЦА...

Гэта нічога, што сёлетні май — халодны. Пяцікурснікам усё роўна горача: ідзе абарона дыпломных работ.

На факультэце журналістыкі — гэта своеасаблівы працэс, у ходзе якога выяўляюцца творчыя магчымасці будучага журналіста, яго ўменне працаваць з матэрыялам.

На апошнім пасяджэнні Дзяржаўнай камісіі было абаронена дзевяць работ студэнтамі дзённага і завочнага навучання. Значную цікавасць прадстаўляюць дыпломныя А. Смольскага «Вобразнасць у марксісцка-ленінскай публіцыстыцы», М. Андруковіч «Журналіст у беларускім дакументальным кіно», М. Мярсона «Урокі майстэрства А. Аграноўскага», А. Казаннікава «Публіцыстыка Якуба Коласа ў гады вайны» і А. Ласмінскага «Фатаграфія на тэлебачанні». Усе яны атрымалі выдатную адзнаку.

Л. ЛІДЗІНА.

## ПА ШЛЯХУ ДА ВЕДАЎ

З першага курса пачынаюць спрабаваць свае творчыя сілы студэнты геаграфічнага факультэта. Гэтая спроба — курсавыя работы. На працягу навучальнага года яны слухаюць адзін з асноўных раздзелаў геаграфічнай навукі «Агульнае землязнаўства», які чытаюць выкладчыкі кафедры фізічнай геаграфіі зарубежных краін. Гэты прадмет дае ўяўленне аб Сусвеце, усеагульных заканамернасцях развіцця планеты Зямля, глыбей знаёміць студэнтаў з такімі паняццямі, як клімат, рэльеф, раслінны і жывёльны свет і г. д. Набытыя веды даюць магчымасць упершыню ў жыцці сесці за напісанне навуковай работы.

Вядома, першыя самастойныя крокі заўсёды даюцца нялёгка. Тут на дапамогу прыходзяць выкладчыкі — кіраўнікі курсавых работ.

— У кіраўніцтве студэнцкімі курсавымі ў нас прымаюць удзел усе члены кафедры, — расказвае яе загадчык прафесар В. Р. Заўрыеў, —ад асістэнта да прафесара. Выдатна спраўляюцца са сваімі абавязкамі настаўнікаў прафесар В. П. Якушка, дацэнт М. В. Лаўрыновіч і многія іншыя.

Зацікавіць студэнта выбранай тэмай, дапамагчы скласці план работы, падабраць неабходную літаратуру і навучыць правільна карыстацца ёю — гэта толькі палова клопатаў. Найбольш пытанняў у студэнта ўзнікае ў працэсе работы. Тут адыгрываюць сваю ролю сістэматычныя кансультацыі. На кафедры фізічнай геаграфіі зарубежных краін яны праводзяцца ў строгай адпаведнасці з графікам, з тым разлікам, каб студэнт і выкладчык маглі рацыянальна спланаваць сваю нагрузку. Вялікую дапамогу пры напісанні курсавых работ аказваюць кабінеты, лабараторыі і мінералагічны музей геафака. Тут заўсёды можна падабраць неабходны матэрыял, атрымаць карысную параду.

З кожным годам расшыраецца тэматыка курсавых работ, паглыбляецца іх змест. Калі на першым курсе студэнты выбіраюць тэмы па агульных раздзелах навукі, то на другім ім прапануюцца больш складаныя і канкрэтныя тэмы, звязаныя, напрыклад, з даследаваннем асобных геаграфічных раёнаў, асобных краін, рэк і г. д. Сёлета, напрыклад, многія работы студэнтаў прысвечаны вывучэнню азёр і рэк Беларусі, методыцы выкладання геаграфіі ў школе, фізіка-геаграфічнай характарыстыцы зарубежных краін, такіх, як Балгарыя, ГДР, Бангладэш. Некаторыя курсавыя работы перарастаюць у дыпломныя. Аб высокай якасці іх выканання гаворыць той факт, што многія напісаныя на іх аснове навуковыя працы вылучаюцца на рэспубліканскі конкурс. У мінулым годзе з 10 такіх работ, вылучаных на агляд, сем атрымалі першую катэгорыю, дзве —другую і толькі адна— трэцюю. А сярэдні бал атрыманых адзнак на абароне курсавых сёлета склаў 4.75. Паспяхова справіліся са сваімі заданнямі студэнты першага курса С. Субоцін, У. Дудкін, Т. Махнач, вячэрнікі III курса В. Казлоў, В. Люсіна і многія іншыя. Напісанне курсавой работы для іх стала яшчэ адной важнай ступенькай да вяршыні ведаў. **А. КОСЦІН.**

## НОВЫЯ КНІГІ ПА ФІЗІЦЫ

1. Березин, Ф. А. Лекции по статистической физике. М., Изд-во Моск. ун-та, 1972.
2. Воспоминания об А. Ф. Иоффе. Сборник. Л., «Наука», Ленингр. отд-ние, 1973.
3. Геронимус, Я. Л. Теоретическая механика. Очерки об основных положениях. М., «Наука», 1973.
4. Пьезополупроводниковые преобразователи и их применение. М., «Энергия», 1973.
5. Радиоспектроскопия. Сборник статей. М., «Наука», 1973.
6. Расчеты атомных и ядерных констант. Вып. 2. Рига, 1972.
7. Смирнов, Б. М. Асимптотические методы в теории атомных столкновений. М., Атомиздат, 1973.
8. Спектроскопия. Методы и применения. Труды 6-го Сибирского совещания по спектроскопии. М., «Наука», 1973.
9. Фано, У. и Купер, Дж. Спектральные распределения сил осцилляторов в атомах. Пер. А. С. Хайкина. М., «Наука», 1973.

## МЕЦЬ СВАЙГО ГЛЕДАЧА

«...Здавалася б, навошта разлучацца з любімымі людзьмі? Дзеля іншых? З якімі таксама разлучацца? А з імі дзеля чаго? Дзеля таго, каб нарэшце разлучыцца з усімі разам?..»

Гэта урывак са спектакля па п'есе А. Валодзіна «З любімымі не разлучайцеся», размова аб якім вялася на творчай сустрэчы студэнтаў IV курса факультэта журналістыкі з рэжысёрамі і артыстамі Рэспубліканскага тэатра юнага гледача імя 50-годдзя камсамола Беларусі. Спектакль, які нікога не пакінуў раўнадушным, не мог не даць штуршка да вялікай і важнай размовы аб праблемах тэатральнага мастацтва наогул, сучасным напрамку яго развіцця і Тэатра юнага гледача ў прыватнасці.

— Задача тэатра з нашай спецыфікай — стварыць свой рэпертуар, мець сваіх аўтараў і, галоўнае, свайго гледача, патрабавальнага і актыўнага, — сказаў у пачатку Мікалай Міхайлавіч Шыйко, галоўны рэжысёр.

І адразу ж пасыпаліся пытанні зацікаўленых студэнтаў.

— Скажыце, ці не баяліся вы, як пастаноўшчык, неразумення з-за вялікай умоўнасці рэжысёрскага рашэння п'есы?

— Кожны па-свойму ўспрымае любы факт. Гэтак жа і з тэатрам. Таму магчымасць неразумення кімсьці не выключаецца. Але ці не здаецца вам, што ёсць у гэтым доля і вашай віны. Тэатр, як вядома, закранае тыя ж праблемы, якія спрабуюць вырашаць усе, і работнікі друку таксама. А журналісты часам не ўдзяляюць належнай ўвагі тэатру.

— Але ж ці не забываецца нярэдка культура ігры акцёра? Чым большая ўмоўнасць, тым большай павінна быць агульная культура акцёра...

— Вядома. Але ва ўмоўнасці ёсць сваё рацыянальнае зерне, якое і прымушае нас звяртацца да такой пастаноўкі п'ес. Глядач павінен думаць. Трэба, каб ён выйшаў з тэатра, а спектакль працягваўся у яго душы, у роздумах. Калі дасягнута гэта — значыць праца артыста не загінула марна.

— Згодны. Гледача патрэбна выхоўваць. Толькі тады можна будзе дасягнуць мэты — выхаваць чалавека. А гэта значыць, што тэатр павінен ісці ўперадзе, весці людзей за сабой.

— Правільна. Наколькі я разумею, перад рэжысёрам стаяла менавіта гэтая задача і пры пастаноўцы п'есы А. Валодзіна. Ідэя неразумення чалавека чалавекам, адзіноты ў натоўпе вырашана вельмі ясна. А думка аб свабодзе ў каханні? Хіба пасля спектакля не разумееш, што абсалютнай свабоды ў каханні не існуе? Свабода ад кагосьці для другога? Ад чаго-небудзь дзеля нечага іншага?

— Вельмі прыемна, што вы разумееце асноўную думку спектакля. У жыцці ж так бывае: побач чалавек, а далёкі. Без сапраўднага разумення нічога быць не можа. Духоўная еднасць павінна будавацца на ўзаемаразуменні...

— Спектакль аказвае моцнае эмацыянальнае ўздзеянне. У сцэнах суда нават хацелася крыкнуць: «Спыніцеся! Не рабіце глупства! Не разлучайцеся з любімымі!» Да глыбіні душы ўзрушвае трагедыя галоўнай гераіні.

— Дарэчы, Юлія Яўгеньеўна, раскажыце аб працы над роляй Кацярыны, — просіць адна са студэнтак Ю. Палосіну.

— Цяжка яна мне давалася. Трагічнасць лёсу, характар гераіні — паказаць гэта рэалістычна нялёгка. Уся справа была ў тым, не як сыграць, а як перажыць, пражыць кавалачак яе жыцця на сцэне. Толькі тады можна пераканаць гледача.

Агульную думку выказаў адзін з журфакаўцаў, які заначыў:

— Я вельмі ўдзячны вам за тое, што спектакль даў штуршок да новых роздумаў, да перагляду сваіх учынкаў і паводзін іншых. Я пасля спектакля стаў па-сапраўднаму вашым гледачом. І чакаю ад вас новых удалых пастановак.

Размова пайшла аб новых спектаклях, аб планах тэатра. Міхаіл Барысавіч Лур'е, рэжысёр - пастаноўшчык спектакля аб М. Святлове «Чалавек, падобны на самога сябе», запрасіў студэнтаў на прэм'еру. Пацікавіўся думкамі аб новым спектаклі (некаторыя са студэнтаў прагледзелі яго) і выказаў жаданне бачыць у студэнтах журфака не толькі гледачоў, але і актыўных памочнікаў калектыву ТЮГа.

— Мы шукаем новыя формы супрацоўніцтва з гледачамі. Мяркуем стварыць саветы гледачоў пры тэатры, так што чакаем вас як сяброў.

На развітанне выкладчыца факультэта Е. Л. Бондарава ад імя прысутных падзякавала гасцям за цікавую і змястоўную гутарку. Але яшчэ доўга не адпускалі студэнты Л. Л. Тарасаву, рэжысёра - пастаноўшчыка спектакля «Чаму ж мне не пець», артыстаў А. П. Крука, Ю. Я. Палосіну, М. М. Шыйко, М. Б. Лур'е. Кожнаму хацелася падзяліцца сваімі думкамі аб мастацтве тэатра, высветліць нешта для сябе. Вывад быў аднадушны: такія сустрэчы павінны быць часцей. Карысць іх узаемная.

**В. ФЯСЬКО,**
**студэнтка журфака.**

# ПАЛЕСКІЯ СКАРБЫ

Кніга, якая ляжыць перад намі, першая з серыі «Беларускі фальклор у сучасных запісах»*. Яна выйшла пад рэдакцыяй народнага артыста СССР, выдатнага знаўцы беларускай народнай творчасці Р. Р. Шырмы. Пільна, уважліва і патрабавальна сачыў ён не адзін год за збіральніцкай работай выкладчыкаў і студэнтаў на сваёй роднай Брэстчыне, удзельнічаў у абмеркаванні матэрыялаў, шчодра дзяліўся з пачынаючымі фалькларыстамі вопытам і ведамі, даваў парады гуртkоўцам, таму і кніга атрымалася незвычайнай.

Першае, на што звяртаеш увагу, — гэта бежава-зялёная вокладка зборніка, якая як бы сімвалізуе само Палессе, яго лясы, лугі, збажыну калгасных палёў. Удала падабран і эпіграф да ўсёй кнігі — радкі з вершаў П. Броўкі:

У Беларусі  
Кожны куточак,  
Дзе ты ні пойдзеш, пяе...  
Звонкае слова,  
Звонкая песня,  
Звонкае сэрца яе.

Адным з такіх куточкаў і з'яўляецца самабытны палескі край, які мае сваю шматвяковую гераічную гісторыю і багатую народную культуру. Творы, сабраныя на Палессі ў наш час, здзіўляюць сваёй красой і сілай. Гэта сапраўдная народная паэзія, якая ніколі не старэе. Не адно пакаленне хвалявала яна сваёй непаўторнай прыгажосцю, высокімі мастацкімі вобразамі. Працягвае яна хваляваць і нашага сучасніка: у народнай паэзіі ён знаходзіць думкі, сугучныя свайму светапогляду.

У аснову кампазіцыі кнігі пакладзен гісторыка - геаграфічны прынцып, які дае магчымасць паказаць своеасаблівасць беларускіх традыцыйных вуснапаэтычных твораў, запісаных у Брэсцкай вобласці ў наш час. Большасць з іх публікуецца ўпершыню. У зборнік уключаны лепшыя ўзоры амаль усіх жанраў беларускага фальклору — песні, частушкі, прыказкі, прымаўкі, загадкі, паданні, казкі.

Як вядома, для славесна-музычных твораў уласцівы злітнасць слова, музыкі і выканання. У зборніку ёсць нотныя праклады, падбор якіх зрабіў галоўны дырыжор Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР У. І. Раговіч. Гэта дало магчымасць паказаць не толькі багатую і разнастайную тэматыку народных песень, але і іх цікавую меладычна-ладавую структуру.

У кнізе ўмела спалучаюцца навуковыя артыкулы, этнаграфічныя апісанні, паэтычны і музычны матэрыял. Змест - указальнік дазваляе ўявіць сабе размер работы, праведзенай пад кіраўніцтвам прафесара Л. І. Фігloўскай і дацэнта В. А. Захаравай студэнтамі - філолагамі і выкладчыкамі І. І. Лушчыцкай, Д. Ф. Фёдаравым, А. В. Карасёвай, Р. І. Яраслаўцавай, Р. М Кавалёвай, І. С. Скарапанавай, Н. П. Еўсцігнеевай, С. М. Ніколенка, В. Д. Літвінкам, Т. В. Здановіч. Вось ужо сем год яны наведваюць вёску за вёскай, знаёмяцца са славутымі народнымі спевакамі, якія даюць магчымасць адчуць непаўторнае хараство, сілу і жыццёвасць фальклору, крочаць партызанскімі сцежкамі, сустракаюцца з праслаўленымі героямі Вялікай Айчыннай вайны, старанна запісваючы ўсё, што мужны, таленавіты беларускі народ збярог для сваіх нашчадкаў.

Кніга «Беларускі фальклор у сучасных запісах» ужо сустрэла ўвагу і прыхільнасць чытачоў, усіх тых, каго хвалюе прыгажосць народнага слова.

**В. БЯЛЯЎСКАЯ.**

---

* Беларускі фальклор у сучасных запісах. Брэсцкая вобласць. Традыцыйныя жанры. Складальнік В. А. Захарава. Мінск, выдавецтва БДУ, 1973.

# СЕМЕСТР АДПАЧЫНКУ

У штабах студэнцкіх будаўнічых атрадаў звычайна ў гэты час удакладняюцца працоўныя аб'екты, байцы вывучаюць тэхніку бяспекі, рыхтуюцца да ўдарнай працы. Хутка рушаць кур'еры, а за імі рэйкі панясуць у розныя раёны краіны эшалоны з байцамі атрадаў. Але не кожнаму студэнту пашчасліўіцца стаць на працоўную вахту. Ім прыходзіцца задумацца над тым, як правесці летнія канікулы. Многія ж пасля залікаў і экзаменаў адчуваюць патрэбу ў адпачынку. Ад разумнай яго арганізацыі залежаць добры настрой, запас бадзёрасці, поспехі ў вучобе.

Ужо цяпер студэнты выбіраюць маршруты турысцкіх паходаў, паездак па гарадах і вёсках нашай Радзімы. Клапоціцца аб арганізацыі адпачынку студэнтаў і прафком БДУ. Па яго пуцёўках многія пабываюць у студэнцкім аздараўленчым спартыўным лагеры «Нарач» на беразе возера Нарач. У пачатку ліпеня падымецца флаг адкрыцця летняга сезону. У лагеры, у адрозненне ад мінулых год, будзе адпачываць замест чатырохсот 750 студэнтаў. Яны атрымаюць магчымасць здаць нормы комплексу ГПА, удзельнічаць у турысцкіх паходах па краіне блакітных азёр, пазнаёміцца з навабудоўлямі савецкай Літвы. Чакае іх і цікавая культурна - масавая праграма. Змогуць студэнты і папрацаваць. Штогод яны аказваюць дапамогу мясцовым калгасам.

Пашырыць прафком і абмен пуцёўкамі ў спартыўна-аздараўленчыя лагеры з іншымі вну. Ужо цяпер вядуцца перагаворы з Ленінградскім, Вільнюскім, Львоўскім, Калінінградскім універсітэтамі. Тыя, хто будзе адпачываць па пуцёўках гэтых вну, пазнаёмяцца з брацкімі рэспублікамі, знойдуць новых сяброў.

Каля двухсот студэнтаў універсітэта адпачнуць па льготных пуцёўках у дамах адпачынку і на турысцкіх базах.

Шырока развіт ва універсітэце так званы самадзейны турызм: пешы, горны, лыжны, водны, паходы. Арганізацыяй, навучаннем, забеспячэннем усім неабходным жадаючых падарожнічаць займаецца турысцкі клуб. Акрамя паходаў па месцах баявой, працоўнай славы савецкага народа, турклуб плануе далёкія паходы па Карпатах, Уралу, Карэльскай АССР.

**М. ДРОЗД,**  
**старшыня прафкома.**





*Для многіх замежных студэнтаў, што прыехалі вучыцца ў БДУ, універсітэцкія сцэны сталі месцам іх творчага адпачынку.*  
*НА ЗДЫМКУ: выступаюць в'етнамскія студэнты.*

Фота *К. ГЕРМАНА.*




## КРЫТЭРЫЙ АРГАНІЗАВАНАСЦІ

Крос — гэта не толькі спартыўны паядынак, але яшчэ і спартыўнае свята, дэманстрацыя арганізаванасці, адзінства, масавасці. І можна з упэўненасцю сказаць, што калі факультэт паспяхова выступае на спаборніцтвах па кросу, то арганізацыйна-спартыўная работа там пастаўлена добра. Менавіта высокай арганізаванасцю можна растлумачыць перамогу каманды ФПМ, якая аказалася намнога мацнейшай за іншыя. Сума месц у каманды ФПМ — 105,4. Далей ідуць каманды: гістфака (145,8), біяфака (174,1), журфака (177,6), хімфака (185,5), матфака (225,3), фізфака (226), філфака (233,3), юрфака (256,5), геафака (268,1).

Здзіўляе слабае выступленне фізфака на кросах. Факультэт, дзе шмат добрых спартсменаў, удзельнікаў розных секцый, мог бы дабіцца большых поспехаў, калі б арганізацыйная работа была лепш пастаўлена.

## ПЕРШЫЯ—ГІМНАСТКІ ФПМ

У гімнастычнай зале адбылося першынство БДУ па мастацкай гімнастыцы. У спаборніцтвах прымалі ўдзел і вядомыя майстры, і разраднiцы з груп падрыхтоўкі. Больш паспяхова ў спаборніцтвах выступілі дзяўчаты каманды ФПМ. Па праграме майстроў паспяхова спаборнічалі Л. Вараб'ёва, А. Цярохіна і Н. Гарбунова. Яны і занялі тры першыя месцы. Хочацца адзначыць майстра спорту, Лену Цярохіну. Выдатніца, на працягу ўжо трох год яна паспяхова выступае за зборную каманду універсітэта.

Сярод дзяўчат-першаразраднiц перамагла студэнтка матфака В. Баканава.

## І ФІЗФАКА

Закончылася першынство БДУ па спартыўнай гімнастыцы. Пераканаўчую перамогу ў спаборніцтвах атрымала каманда фізічнага факультэта, другое і трэцяе месцы адпаведна ў гістфака і біяфака.

Чэмпіёнамі БДУ 1973 года сталі майстры спорту Н. Леташкова і Л. Палхоўскі.

## ПАЦВЯРДЖЭННЕ РАНГУ

Закончыліся спаборніцтвы на першынство БДУ па шашках і шахматах. У абодвух турнірах перамогу атрымалі каманды ФПМ. Гэта не дзіўна, таму што зборныя універсітэта па гэтых відах спорту базіруюцца на аснове каманд ФПМ, у ліку якіх шмат вядомых майстроў. Сярод іх чэмпіён рэспублікі У. Беляеўскі, майстар спорту Г. А. Драбушэвіч, майстры спорту па кампазіцыі А. І. Глушцоў і П. П. Матус. Дарэчы, апошні быў прызёрам першынства СССР па кампазіцыі. У састаў каманды ўваходзяць кандыдаты ў майстры спорту Ч. Роліч, І. Ярошын, Ю. Шапёлкін, першаразраднікі А. Эйсмант, У. Камароўскі і П. Герасімовіч, другаразрадніца Н. Сарокіна.

У зборнай па шахматах гуляюць кандыдаты ў майстры спорту Т. Косціна — сярэбраны прызёр першынства БССР, член зборнай БДУ А. Літвіненка і іншыя.

Наступныя месцы ў камандным турніры размеркаваліся такім чынам: па шашках на II месцы фізфак, далей ідуць матфак, хімфак, юрфак, гістфак; па шахматах на II месцы гістфак, на наступных матфак, фізфак, хімфак, журфак, філфак, юрфак, біяфак.

* * *

На кальцавой шашы праведзена першынство універсітэта па веласпорту. Перамогу атрымала каманда юрыдычнага факультэта.

Чэмпіёнамі сталі студэнт журфака, майстар спорту міжнароднага класа У. Пац і студэнтка юрфака С. Дзюба.

*П. ГЕРАСІМОВІЧ,*  
*член праўлення спортклуба БДУ.*

## НА ПРЫЗ ПРАФКОМА

У нядзелю на універсітэцкім стадыёне пачалося першынство сярод інтэрнатаў па футболу на прыз прафкома. Першымі сустрэліся каманды інтэрнатаў № 7 і № 5. З лікам 7:3 перамаглі прадстаўнікі інтэрната № 7. Галы ў камандзе-пераможцы забілі М. Лазук, В. Шлык, Л. Забела, М. Камаеў, Л. Вальковіч. Нягледзячы на дрэннае надвор'е і слабае судзейства, гульня прайшла даволі цікава. Большасць гледачоў мела магчымасць назіраць за матчам, не пакідаючы сваіх пакояў, з вакан інтэрната. Хочацца спадзявацца, што ў хуткім часе адбудзецца аналагічнае першынство па валейболу і баскетболу.

*М. КАРНЯЙЧУК.*

# МЕСЯЧНІК БЯСПЕКІ РУХУ

Вясна ўносіць свае карэктывы ў бяспеку дарожнага руху. Значна павялічваюцца аўтамабільныя і людскія патокі на вуліцах. Разам з гэтым павялічваецца і магчымасць дарожна-транспартных здарэнняў. Таму невыпадковае рашэнне МУС СССР іменна ў гэтую пару, з 15 мая па 15 чэрвеня, праводзіць у краіне месячнік бяспекі руху. Мерапрыемства гэта ўжо стала традыцыйным, паколькі праводзіцца кожны год. Мэта яго — дабіцца, каб на нашых вуліцах і дарогах паменшылася колькасць дарожна-транспартных здарэнняў, скараціўся лік няшчасных выпадкаў.

Мінулагодні месячнік яшчэ раз пераканаўча даказаў сваю карысць: у гэты перыяд на 18 працэнтаў панізілася дарожная аварыйнасць, скарацілася колькасць парушэнняў правіл сярод пешаходаў і вадзіцеляў. У гэтым заслуга не толькі адной міліцыі. Вялікі ўклад унеслі грамадскія арганізацыі, прадпрыемствы, школы, вну. І цяпер, складаючы планы месячніка, мы вялікія надзеі ўскладалі на сваіх памочнікаў: рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў, студэнтаў, выкладчыкаў школ і інстытутаў. Выканком Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных прыняў спецыяльнае рашэнне аб правядзенні месячніка. Зыходзячы з гэтага рашэння, кіраўнікі аўтатранспартных цэхаў, аўтамабільных паркаў, гаражоў павінны паклапаціцца аб тым, каб мэты і задачы месячніка былі даведзены да кожнага вадзіцеля. Гэтае пытанне рэкамендуем уключыць і ў павестку партыйных і камсамольскіх сходаў, дзе былі б намечаны канкрэтныя мерапрыемствы па бяспецы руху транспарту і пешаходаў.

Вядома, што пешаход — асноўная фігура на вуліцы, таму выхаванню пешахода павінна быць нададзена першачарговае значэнне. У школах, гарадскіх піянерскіх лагерах, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, а таксама на прадпрыемствах неабходна праводзіць планамерную работу па вывучэнню правіл дарожнага руху. Неабходна ў кожным калектыве выдзеліць грамадскіх прапагандыстаў. Прапагандыстам правіл руху можа быць кожны, найбольш падрыхтаваны ў гэтых адносінах чалавек: старшакласнік, настаўнік, студэнт, інжынерна-тэхнічны работнік і г. д.

Падтрыманне ўсіх гэтых патрабаванняў будзе садзейнічаць парадку ў дарожным руху, скароціць колькасць дарожных няшчасцяў.

**І. ХУДЗЕЕЎ,**  
**начальнік ДАІ УУС Мінгарвыканкома.**

## ЗАПРАШАЕ СПАРТЫЎНЫ ЛАГЕР

Сёлета спартыўна-аздараўленчы лагер будзе працаваць у тры змены: I — з 1 па 20 ліпеня, II — з 20 ліпеня па 8 жніўня, III—з 8 па 27 жніўня. Каб забяспечыць сябе пуцёўкай, не траціце часу і падавайце заявы ў прафбюро факультэтаў.

**М. МАЦЕЙКА.**

Рэдактар  
**А. А. НІКОЛЕНКА.**

**Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон — 22-07-19.**  
АТ 05239  
**Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.**  
Заказ 544.